formirovaniya-sotsialnoy-uspeshnosti-yunoshey-sredstvami-sotsialno-pedagogicheskoy-deyatelnosti-v. – Дата доступа : 02.03.2019.
2. Ясвин, В.А. Образовательная среда: от моделирования к проектированию / В.А. Ясвин – М. : Смысл, 2001. – 365 с.

## ЭФЕКТЫЎНЫЯ ПРЫЁМЫ ФАРМІРАВАННЯ ВУЧЭБНА-КАМУНІКАТЫЎНЫХ НАВЫКАЎ ПРАКТЫКАНТАЎ

***А.П.Валіахметава***
***Пінскі каледж УА “БрГУ імя А.С.Пушкіна”***

Падчас правядзення практыкі "Пробныя ўрокі" навучэнцы педагагічнага каледжа адзначаюць самую асноўную цяжкасць для іх: выкладанне ўрокаў на беларускай мове, такіх, як беларуская мова, беларуская літаратура, Мая Радзіма - Беларусь.

Па словах саміх жа практыкантаў ім цяжка размаўляць па-беларуску. Гэта сапраўды праблема, якая патрабуе тэрміновага вырашэння, таму што ад настаўніка ў вялікай ступені залежыць стан беларускай мовы ў сучасным грамадстве. А нашы навучэнцы - гэта будучыя настаўнікі.

Чаму ж нашым практыкантам так цяжка размаўляць па-беларуску і як гэту праблему можна вырашыць і і разглядаецца ў дадзенай рабоце.

Па-першае, небходна праанalізаваць вучэбныя планы спецыяльнасці "Пачатковае навучанне", якія дысцыпліны выкладаюцца на беларускай мове і іх колькасць. Я разглядала толькі прафесійны кампанент, бо палова навучэнцаў аддзялення паступаюць вучыцца ў педагагічны каледж на базе агульнай сярэдняй адукацыі.

Аналіз тыпавога вучэбнага плана 2018 года паказаў наступнае. На беларускай мове выкладаюцца дысцыпліны: сучасная беларуская мова (126 гадзін), методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ( 66 гадзін ), беларуская дзіцячая літаратура (48 гадзін), беларуская мова (прафесійная лексіка) - 20 гадзін, методыка выкладання прадмета "Мая Радзіма - Беларусь" (20 гадзін). Усяго - 280 гадзін. Нельга сказаць, што гэтага мала. Але, улічаваючы тое, што па-беларуску навучэнцы не размаўляюць у паўсядзённым жыцці, моўнай практыкі недастаткова.

Неабходна яшчэ ўлічваць той факт, што камунікатыўныя ўменні навучэнцаў развіваюцца сродкамі той мовы, якая абслугоўвае яго



Репозиторий БрГУ

стасункі з навакольным светам. Не сакрэт, што для большасці такой з'яўляецца руская мова, бо, як слушна адзначае А. А. Лукашанец, "фактычна ў сённяшніх умовах беларуская мова – мова тытульнай нацыі і першая дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь – займае другараднае становішча ў моўнай сітуацыі". Абмежаванае функцыянаванне беларускага маўлення ў грамадстве прывяло да таго, што моўнае асяроддзе дапаўняецца сітуацыямі, у якіх дамінуе беларуская мова, толькі дзякуючы школьнаму навучанню і навучанні ў педегегічным каледжы. А гэта значыць, што беларуская мова, якую навучэнец вывучае спецыяльна, для яго ў сучасным жыцці, на жаль, другая. [ 2, с.12 ]

Навучэнцам аддзялення "Пачатковае навучанне" было прапанавана разгорнута адказаць на наступныя пытанні: чаму вы дрэнна валодаеце беларускай мовай? якія мерапрыемствы, на ваш погляд, неабходна арганізоўваць перад выхадам на практыку, каб урокі на беларускай мове былі больш эфектыўнымі?

Над дадзенымі пытаннямі разважалі навучэнцы трэціх і чацвёртых курсаў. Многія апытваемыя лічаць, што эфектыўнасць правядзення ўргокаў на беларускай мове залежыць не толькі ад ведання методыкі выкладання асобных дысцыплін, але, у першую чаргу, ад ведання беларускай мовы. Многае залежыць ад самаадукацыі. Неабходна больш чытаць па-беларуску, а рыхтуючыся да ўрока, мала проста спланаваць і вывучыць канспект, неабходна разумець сэнс усіх слоў. Некаторыя навучэнцы ў сваіх адказах адзначаюць, што пры падрыхтоўцы да ўрокаў ім не хапае ў іх актыўным слоўніку звычайных слоў, якія выкарыстоўваюцца на кожным уроку. Таксама навучэнцы выказваюць думку аб тым, што ім не хапае практычнага выкарыстання беларускай мовы.

Назіраючы і аналізуючы ўрокі практыкантаў, я вылучала найчасцей ужывальныя моўныя памылкі. Так, практыканты блытаюць склонавыя формы зваротнага займенніка *сябе,* памыляюцца ў скланенні назоўнікаў жаночага роду з асновай на г, к, х ( дочцы - замест дачцэ; кніге - замест кнізе; у гэтай казкі - замест у гэтай казцы; на сцежке - замест на сцежцы), часта ўжываюць русізмы з асаблівасцямі ўжывання беларускай мовы, напрыклад, "маладзец", "ліча", "слушаюць", "апяць", "палучае", "вызывала", "харашо" і ншыя, парушаюць акцэнталагічную норму: бУйны - замест буйнЫ, гавОрыла - замест гаварыла, блУкае - замест блукАе і ншыя.

Каб павысіць моўную культуру і якасць урокаў на беларускай мове ў нашых практыкантаў, я распрацавала некаторыя прыёмы і заданні, якія можна прапанаваць перад выхадам на практыку, або падчас падрыхтоўкі да канкрэтнага ўрока на беларускай мове.



Репозиторий БрГУ

1. Выкананне практыкаванняў па беларускай мове:

1.1. Праскланяць назоўнікі старонка, кніга, страха, хата (такім чынам мы замацоўваем скланенне назоўнікаў з асноваў на г, к, х і т );

1.2. Праскланяць займеннік сябе.

2. Падабраць словы і словазлучэнні, якія можна выкарыстоўваць для ацэнкі дзейнасці вучняў на ўроку. (Напрыклад: малайцы, дзякую за работу, вы ўважліва слухалі, шчыра папрацавалі і г.д.)

3. Падабраць словы і словазлучэнні для актывізацыі вучэбнай дзейнасці. (Напрыклад: будзьце ўважлівы, не перашкаджйце адзін аднаму, хто першы выканае - паднімае руку і г.д. )

4. Правядзенне моўных размінак з мэтай выпрацоўкі дыкцыі і правільнага маўлення. Напрыклад:

Дождждык з сонцам напалам
Па лісці залапатаў.
Пад ліпкаю падажду,
Не пайду па дажджу.
джай-джай-джай - багаты ўраджай
джу-джу-джу - па саду я хаджу
джы-джы-джы - ідуць дажджы ) [1, с.23 ]

5. Падбор фізкультхвілінак. Напрыклад:

а)Сонца шчыра ўсміхнулася (кругавыя рухі рукамі)
Мы падняліся, апрануліся, (устаць)
На лыжню ўсе дружна сталі, (рухі лыжніка)
Хутчэй ветрыка памчалі!
Трапна ў цэль страляць мы будзем: (імітавць стрэльбу)
Ні хвілінкі не марудзім! (бег на месцы)
Скажам шчыра: "Мара наша –
Быць як Домрачава … Даша”. (папляскаць у далоні)

б).Як толькі сонейка прачнецца, (устаць з-за парт)
За справы ўміг яно бярэцца! (кругі рукамі)
Разбудзіць сонных дзетак, (пацерці вочкі)
Сагрэе лес, палетак, (абняць сябе за плечы)
Дасць моцы ўсім, хто хворы, ( зрабіць рыўкі рукамі)
І падтрымае ў горы. (паціснуць адзін аднаму рукі)
Я вельмі прашу: "Сонца, (папляскаць у далоні)
Зірні ў наша аконца!” [1, с.16 ]

6. Складанне тэматычных слоўнікаў. Перад првядзеннем урока па прадмеце "Мая Радзіма - Беларусь" скласці ўласны тэматычны слоўнік. (Напрыклад. Тэма "Ад батлейкі да паланэза"

Лялечны тэтар - кукольный театр
вопратка - одежда



Репозиторий БрГУ

друкарня - типография
гледачы - зрители
сучасныя слухачы - современные слушатели
выяўлены - изображен
прыгажосць - красота
чаруе - завораживает.

7. Стварэнне ўмоў для трывалага засваення новай лексікі і выкарыстання яе ў гутарковых сітуацыях:

складанне словазлучэнняў і сказаў;
развучванне вершаў, скорагаворак, прыказак і прымавак і г.д.;
чытанне тэкстаў, дзе ўжываюцца словы па тэме.

8. Падбор слоў для характарыстыкі літаратурных герояў, як станоўчых. так і адмоўных. ( Напрыклад, шчыры, ласкавы, працавіты, сардэчны, сарамяжлівы, кемлівы, старанны, разумны; гультаяваты, злы, жорсткі, хітры, лянівы, чэрствы, крыважэрны, хлуслівы і г.д.)

9. Аналіз падручнікаў. Навучэнцам прапануецца адказаць на пытанне:

- Калі б вы былі аўтарам падручніка:
а) Як бы вы растлумачылі вучням гэтую тэму?
б) Як бы вы растлумачылі неабходнасць гэтай тэмы?
в)Як бы вы праілюстравалі гэтую тэму?

10. Назваць пяць спосабаў прымянення ведаў і ўменняў па тэме ў жыцці.

Пры авалоданні беларускай мовай неабходна памятаць, што суразмоўніцтва залежыць ад самакантролю маўлення, асэнсавання камунікатыўнай значнасці моўных адзінак. Таму абавязковым з’яўляецца авалоданне такімі якасцямі маўлення, як *багацце, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць і дарэчнасць.*Багатае і правільнае маўленне залежыць ад засвоеных сродкаў мовы, якія складаюць актыўны слоўнік навучэнцаў.

Практыканты павінны ўсвядоміць, што толькі дасканалая і адказная падрыхтоўка да кожнага ўрока з'яўляецца галоўнай умовай яго якасці і паспяховасці.

Спіс выкарыстанных крыніц:

1. Паўлоўская, В.І. Мова: цікава і займальна / В.І. Паўлоўская. – Мінск.: Нар. асвета. – 1989. – 221 с.

2. Мартынкевіч С. В. Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы.Мінск, “Выдавецкі цэнтр БДУ”, 2010



Репозиторий БрГУ